# Пасрэднік паміж мінулым і сучасным пакаленнямі

БПУ+37(476)2

**В. У. Чэчат,**
доктар педагагічных навук, прафесар кафедры прыватных методык Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДПУ імя Максіма Танка

## Выпрабаванне мінулага пакалення цяжкім лёсам

Іван Аляксандравіч Сачук (нарадзіўся 5 мая 1935 г. у вёсцы Казіміраўская Буда Мазырскага раёна Гомельскай вобласці) увасабляе сабою нялёгкі лёс многіх беларусаў у XX стагоддзі. Не паспеў хлопчык налюбавацца сонейкам, лесам і лугам свайго хутарка Любіша, што на Мазыршчыне, як пачалася Вялікая Айчынная вайна. Бацька, Аляксандр Мітрафанавіч, з першых дзён пайшоў на фронт абараняць радзіму, а маці, Тэкля Дзмітрыеўна, засталася адна з чатырма дзецьмі. Яна перайшла з хутара жыць у Буду Казіміраўскую, што побач з Раманаўкай.



21 сакавіка 1943 г., калі Іван пайшоў у Раманаўку наведаць бабулю Марту Іванаўну, здарылася самае жудаснае і трагічнае для жыхароў Буды Казіміраўскай. Ноччу фашысцкія карнікі спалілі сорак двароў разам з жыхарамі. У агні згарэлі маці Івана і тры яго сястрычкі: трынаццацігадовая Таня, сямігадовая Шура і чатырохгадовая Поля. Родзічы пахавалі іх астанкі ў адной магіле.

У канцы вайны здарылася яшчэ адна бяда: Іван атрымаў пахавальную на бацьку, які загінуў у баі пад Варонежам. Цяжка было хлапчуку. Сірату даглядала бабуля, затым дзядзька (так вялося сярод людзей у тыя пасляваенныя гады на Беларусі: усе родзічы і сяльчане даглядалі і расцілі сірот). У дзядзькі ў Каўнасе пляменнік закончыў з адзнакай сем класаў прагімназіі. Марыў Іван стаць настаўнікам. З 1951 па 1955 год вучыўся ў Мазырскім педагагічным вучылішчы, затым працаваў настаўнікам пачатковых класаў у Дубраўскай сярэдняй школе Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

У 1956 г. ён — студэнт юрыдычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава. У 1967 г. паступіў у аспірантуру Маскоўскага педагагічнага інстытута, дзе сфарміраваўся як будучы вучоны і педагог. Паспяхова абараніў дысертацыю і стаў кандыдатам гістарычных навук.

З 1974 г. І. А. Сачук працуе ў Мазырскім пединстытуце. З 1976 г. быў выбраны па конкурсе на пасаду загадчыка кафедры, з 1980 г. — дацэнт. Зараз І. А. Сачук дацэнт кафедры гісторыі і методыкі выкладання гісторыі. У гэтым годзе яму споўніўся 71 год.

Вучоны і педагог-выхавацель усю энергію, веды, плённую працу, жыццёвы вопыт аддае любімай справе — вы-

хаванню і адукацыі сучаснага пакалення маладых настаўнікаў.

### Педагагічнае крэда

У апошнюю трэць XX стагоддзя індустрыяльная цывілізацыя падыйшла да мяжы, за якой чалавечае жыццё пачынае падвяргацца страшэнным перагрузкам і дэфармацыям. Працэсы, якія яна парадзіла, прыйшлі ў супярэчнасць з прыродай вялікай часткі людзей, таму яны стамляюцца ад імклівасці часу, мноства павярхоўных узаемаадносін, інфармацыйных перагрузак, празмернай стандартызацыі. Асноўныя магчымасці многіх людзей аказваюцца вычарпанымі, ускладнена іх сацыялізацыя. Чалавецтва перажывае пераломную эпоху, аналага якой, магчыма, не было ў сусветнай гісторыі. Яна характарызуецца комплексам найскладанейшых праблем агульнапланетарнага, глабальнага характару, калі разбураецца сацыяльная абароненасць людзей, сістэмы аховы здароўя, экалогіі, адукацыі.

Як лічыць І. А. Сачук, галоўная мэта адукацыі — не толькі і не столькі ў набыцці ведаў, а ў фарміраванні спосабу бачання і разумення рэчаў і працэсаў, арганізацыі ўнутранага свету асобы ў адпаведнасці з вышэйшымі духоўнымі каштоўнасцямі. Асноўная задача педагагічнай ВНУ бачыцца Івану Аляксандравічу ў тым, каб выпускнік сфарміраваўся як прафесіянал і асоба, здольная да самаўдасканалення, развіцця і самаразвіцця. Актуальная праблема, на яго погляд, — удасканаленне падрыхтоўкі педагагічных кадраў, пераадоленне яе адставання ад працэсаў абнаўлення школьнай адукацыі. Яна павінна быць апераджальнай у адносінах да практычнай дзейнасці навучальных устаноў.

Удасканаленне падрыхтоўкі настаўнікаў звязана з гуманізацыяй вучэбна-выхаваўчага працэсу сярэдняй агульнаадукацыйнай школы. Па-першае, размова ідзе аб паступовым і прадуманым пераходзе (па меры набыцця становучага вопыту) да новых адукацыйных тэхналогій, што зарыентаваны на асобу вучня, яго творчасць, развіццё ўмення самастойна вучыцца. Па-другое, змяненне адносін у сістэме «настаўнік — вучань», калі педагог — не толькі пасрэднік паміж вучнем і ведамі, але і дарадчык, вышэйшы аўтарытэт, узорны прыклад. Па-трэцяе, змяненне адносін паміж вучнем і школай, калі апошняя ўспрымаецца ім як другі дом, як важнейшая апора і фундамент для ўсяго наступнага жыцця.

На думку І. А. Сачука, бліжэйшая мэта навучання — гэта стварэнне сітуацый поспеху, спаборніцтва, падтрымкі ўнутранай годнасці, даверу. Навучанне можа быць каштоўным як пазнавальная і цікавая праца, лад жыцця, як галоўная праграма ў жыцці школьніка.

### Багаты плён

І. А. Сачук — аўтар каля 100 навуковых і вучэбна-метадычных прац. Сярод іх — дапаможнікі, навукова-папулярныя брашуры, праграмы, метадычныя рэкамендацыі, артыкулы, тэзісы дакладаў на навуковых і навукова-практычных канферэнцыях. Кола яго інтарэсаў і захапленняў рознабаковае: ад метадалагічных да метадычных і практыка-арыентаваных праблем, над якімі вучоны пастаянна працуе, рэгулярна дакладвае педагагічнай грамадскасці пра вынікі сваёй вопытна-эксперыментальнай і даследчыцкай работы. Вось толькі некаторыя напрамкі яго навуковых даследаванняў за апошнія 10—15 гадоў і тэматыка дакладаў і паведамленняў.

*Адукацыя, культура і падрыхтоўка асобы сучаснага настаўніка* («Філасофія адукацыі і праблема свабоды педагагічнай творчасці», «Агульначалавечыя каштоўнасці і нацыянальныя прыярытэты», «Гуманітарызацыя адукацыі і праблемы падрыхтоўкі педагога-выхавацеля», «Роля рынку ў сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў працоўнага навучання», «Актуальныя праблемы адукацыі студэнцкай моладзі і падрыхтоўка будучага настаўніка: шляхі і сродкі», «Праблемы фарміравання культуры будучага настаўніка»).

*Выхаванне і навучанне студэнцкай моладзі* («Актуальныя праблемы адукацыі і выхавання і шляхі іх вырашэння», «Навучанне і выхаванне: праблема фарміравання ўсебакова развітай асобы», «Ідэалагічнае суправаджэнне выхаваўчага працэсу», «Новае мысленне і праблемы навучання студэнцкай моладзі», «Асоба выкладчыка як вызначальны фактар вучэбна-выхаваўчага працэсу ў педагагічнай ВНУ»).

*Праблема ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС* («Некаторыя пытанні ліквідацыі сацыяльна-эканамічных вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС», «Чарнобыльская катастрофа і праблемы фарміравання экалагічнай культуры ў навучэнскай і студэнцкай моладзі»).

*Спецыфіка выкладання правоў чалавека ў вышэйшых навучальных установах* («Правы чалавека — найвялікшая агульначалавечая каштоўнасць», «Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека і сучасная структура правоў чалавека», «Права чалавека на неумяшанне ў асабістае жыццё (з вопыту выкладання)», «Фарміраванне культуры правоў чалавека», «Роля права ў фарміраванні маральных якасцей будучага настаўніка»).

*Духоўныя, культурныя і гістарычныя сувязі славянскіх народаў, развіццё нацыянальных адносін, інтэрнацыянальнае і патрыятычнае выхаванне* («Гуманітарныя навукі і славянская ідэя адзінства», «Інтэрнацыянальнае і патрыятычнае выхаванне студэнтаў», «Патрыятычнае выхаванне старшакласнікаў»).

*Фарміраванне асобасных і прафесійных якасцей будучага настаўніка* («Роля асобы выкладчыка ў падрыхтоўцы будучага настаўніка», «Падрыхтоўка настаўніка — педагога і выхаваццеля»).

У апошнія гады І. А. Сачук працуе над манаграфіяй «Здароўе — праз адукацыю».

У даследаваннях вучонага адной з найважнейшых з'яўляецца праблема асобы выкладчыка ў фарміраванні прафесійна-педагагічных і маральных якасцей настаўніка. Абагульняючы асобасныя якасці, неабходныя настаўніку для эфектыўнай работы ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, І. А. Сачук выдзяляе ў першую чаргу наступныя:

1. Імкненне да максімальнай гібкасці.
2. Здольнасць да эмпатыі, гэта значыць, разуменне пачуццяў іншых, гатоўнасць адклікацца на іх патрэбы і запыты.
3. Уменне надаць асобасную афарбоўку выкладанню.
4. Устаноўка на стварэнне пазітыўных стымулаў для самавыхавання вучняў.
5. Авалоданне стылем нефармальных, дэмакратычных, гуманных узаемін з вучнямі.
6. Эмацыянальная ураўнаважанасць, упэўненасць у сабе, жыццярадаснасць.

На думку І. А. Сачука, культура як асноватворная дамінанта адукацыі фарміруецца толькі культурай, а асоба настаўніка — толькі асобай выкладчыка як прадстаўніка гэтай культуры, прафесіянала, вучонага, выхаваццеля, суайчынніка, пасрэдніка паміж мінулым і сучасным пакаленнем.

# ИГРЫ НАШИХ БАБУШЕК И ДЕДУШЕК

## Часть и целое

Играющие становятся по кругу. В середине круга ведущий. В руках у него мяч. Ведущий бросает мяч любому участнику игры и называет при этом деталь какого-либо предмета. Тот, кому брошен мяч, должен поймать его и сейчас же назвать предмет, к которому относится деталь, упомянутая ведущим. Например: крыло — самолет или птица; труба — паровоз, дом, пароход, фабрика; лепесток — цветок; пряжка — пояс; обруч — бочка и т.п.

Если участник игры ошибется и назовет предмет, не соответствующий детали, или, поймав мяч, замешкается с ответом, то он поднимает руку. Опустить ее играющий может лишь после того, как ответит правильно, когда через некоторое время ведущий бросит ему мяч вторично. Выигравшими считаются те, кому ни разу не пришлось поднимать руку.

Условия этой игры могут быть другими. Ведущий, бросая мяч, говорит начальную часть какого-нибудь слова (имени существительного). Участник игры ловит мяч и немедленно заканчивает слово. Например: ра-дость, ко-лос, лан-дыш, лас-точка.